УДК 351.85+004

# ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАДТРЫМКА ТРАНСЛЯЦЫІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ СРОДКАМІ НОВЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

**Худніцкая Алена Віктараўна**
старшы выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у турызме і гасціннасці Інстытута турызму ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры»
(г. Мінск, Беларусь)

Адной з актуальных праблем, якія вылучаюцца даследчыкамі гісторыі і культуры Беларусі, з'яўляецца праблема трансляцыі гісторыка-культурнай

спадчыны і рэпрэзентацыі помнікаў культуры. Традыцыйныя інстытуты і формы перадачы інфармацыі вельмі хутка трансфарміруюцца ва ўмовах інфармацыйнага грамадства, з'яўляюцца новыя формы камунікацыі, новыя сацыяльныя тэндэнцыі, якія ўплываюць на зацікаўленасць моладзі ў атрыманні гістарычных ведаў і выбар крыніц па гэтай тэматыцы.

У сувязі з гэтымі працэсамі, асаблівае месца ў даследаваннях займаюць новыя формы трансляцыі ведаў, і ў першую чаргу – разнастайныя тыпы інтэрнэт-рэсурсаў, напрыклад, віртуальныя музеі і выставы, архівы і бібліятэкі, дыстанцыйныя курсы і «віртуальныя ўніверсітэты», а таксама тэматычныя і даведачныя рэсурсы, што не маюць у сваіх назвах спасылак на добра знаёмыя нам сацыякультурныя інстытуты, але пры гэтым выконваюць блізкія функцыі. Напрыклад, сайты турыстычнай тэматыкі, якія, звычайна, засяроджваюць сваю ўвагу на помніках матэрыяльнай спадчыны Беларусі, архітэктурных і іншых помніках, іх гісторыі і каштоўнасці ў маштабе нацыянальнай і сусветнай культуры.

Падобныя рэсурсы ўсё часцей разумеюцца як частка комплексу традыцыйных сацыякультурных інстытутаў, што з аднаго боку дапаўняе іх дзейнасць, з'яўляецца іх працягам у віртуальнай прасторы, апасродкаванай камп'ютарнай тэхнікай, а з другога боку ўплывае на іх палітыку, дае магчымасць ажыццяўляць такія ідэі, якія раней здаваліся немагчымымі ці занадта складанымі ў рэалізацыі. Напрыклад, ідэя роўнага агульнага доступу да гістарычных (і іншых) ведаў для ўсіх магчымых аўдыторый: выкарыстанне інтэрнэт-рэсурсаў дазваляе далучыцца да ведаў і культурнай спадчыны людзям з абмежаванымі магчымасцямі, беларусам, якія фізічна знаходзяцца далёка ад культурных цэнтраў, ці ўвогуле пражываюць па-за межамі Беларусі.

Магчымасцям і тэндэнцыям развіцця дзейнасці сацыякультурных устаноў у віртуальнай прасторы прысвечана вялікая колькасць даследаванняў, свой унёсак робяць музейныя спецыялісты, гісторыкі, культуролагі, прадстаўнікі сферы адукацыі. Але якія б перспектывы не абмяркоўвалі даследчыкі, практычная рэалізацыя гэтых ідэй непасрэдна звязана са станам інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры і тэхналогій, а таксама з агульнымі праграмамі развіцця, прынятымі ў краіне.

Развітыя інфармацыйна-камунікацыйная тэхналогіі (ІКТ) дазваляюць забяспечыць доступ вялікай колькасці карыстальнікаў да рэсурсаў Інтэрнэт і лакальных сетак, ў тым ліку да 360-панарам помнікаў і гістарычных мясцін, да буйных віртуальных бібліятэк, да калекцый ілюстрацый і рэпрадукцый высокай якасці і г.д.

Дзейнасць па развіцці інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры не з'яўляецца стыхійнай, наадварот, яна вызначаецца вялікай колькасцю міжнародных і нацыянальных стандартаў, стратэгій і праграм. У нашай краіне



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

дзейнічае Дзяржаўная праграма развіцця лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства на 2016–2020 гады [1].

Мэтай Дзяржаўнай праграмы з'яўляецца ўдасканаленне ўмоў, што спрыяюць трансфармацыі сфер чалавечай дзейнасці пад уплывам ІКТ, улічваючы фарміраванне лічбавай эканомікі, развіццё інфармацыйнага грамадства і ўдасканаленне электроннага ўрада. Трансфармацыі бізнес-працэсаў з дапамогай ІКТ ва ўсіх сферах жыццядзейнасці сучаснага грамадства прысвечана «падпраграма 3», але ў праграме не адлюстравана, якія чакаюцца культурныя трансфармацыі.

Дзяржаўныя ўстановы культуры ў сваёй дзейнасці кіруюцца, канешне, не асобнымі рэкамендацыямі навукоўцаў і агульнымі тэндэнцыямі развіцця інфармацыйнага грамадства, а палажэннямі праграм па развіццю культуры. Актуальная Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі» на 2016–2020 гады змяшчае сярод іншых наступныя тэзісы [2]:

– запланавана стварэнне лічбавых копій архіўных дакументаў;

– асаблівае значэнне мае праца бібліятэк па фарміраванні электронных інфармацыйных рэсурсаў;

– перспектыўнымі доўгатэрміновымі праектамі з'яўляюцца: стварэнне Нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі, карпаратыўнай службы электроннай дастаўкі дакументаў на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, выкарыстанне ў дзейнасці бібліятэк хмарных тэхналогій.

Таксама адзначаецца, што пры ажыццяўленні мерапрыемстваў праграмы павінна ўлічвацца забеспячэнне інавацыйнага развіцця сферы культуры, выкарыстання сучасных кіраўніцкіх, інфармацыйных і іншых тэхналогій у дзейнасці ўстаноў культуры (як механізма па кіраванні рызыкамі). Але каментарыі, якім чынам павінна адбывацца гэта забеспячэнне, адсутнічаюць. Сярод нявырашаных праблем адзначаюцца недастатковыя тэмпы інфарматызацыі сферы гісторыка-культурнай спадчыны і яе прысутнасці ў сусветнай інфармацыйнай прасторы, няроўны доступ да музейных і бібліятэчных фондаў жыхароў населеных пунктаў, дзе адсутнічаюць стацыянарныя ўстановы культуры.

Можна заўважыць, што ў стратэгіях і праграмах па развіццю эканомікі і тэхналогій празрыста адлюстроўваюцца актуальныя тэндэнцыі інфармацыйнага грамадства. Адпаведныя (калі не больш выбітныя) тэндэнцыі прысутнічаюць таксама і ў культуры, але пакуль што адзначаюцца ў праграмах развіцця фрагментарна ці нават ускосна. Гэта значыць, што выкарыстанне новых тэхналогій установамі культуры застаецца на сённяшні дзень стыхійным і не суправаджаецца такім комплексам мерапрыемстваў, як у іншых сферах дзейнасці. Гэта замінае прафесіяналізацыі працы з віртуальнымі філіяламі ўстаноў культуры і працяглай якаснай падтрымцы створаных рэсурсаў, і ў выніку – самой трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны з дапамогай інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

І тым больш уважлівымі павінны быць даследчыкі: сучасныя працы культуролагаў, сацыёлагаў, філосафаў, гісторыкаў – гэта патэнцыйнае абгрунтаванне для наступных крокаў у падтрымцы тых ці іншых накірункаў развіцця культуры. Яны могуць дапамагчы наладзіць актуальныя формы трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны, пашырыць доступ да гістарычных ведаў розным катэгорыям насельніцтва, стварыць умовы для больш поўнай творчай рэалізацыі моладзі, садзейнічаць захаванню нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларускай дыяспары і папулярызацыі беларускай мовы і культуры за мяжой.

**Літаратура**


1. Государственная программа развития цифровой экономики и информационного общества на 2016 – 2020 годы: утв. Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 23.03.2016 № 235 [Электронный ресурс] / Совет Министров Республики Беларусь. – Минск, 2016. – Режим доступа: http://www.government.by/upload/docs/file4c1542d87d1083b5.PDF. – Дата доступа: 25.03.2017.
2. Государственння программа «Культура Беларуси» на 2016 – 2020 гг. [Электронный ресурс] / Министерство культуры Республики Беларусь. – Минск, 2016. – Режим доступа: http://www.kultura.by/by/zakanadautva-kultury/. – Дата доступа: 25.03.2017.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова